# 3 мільёны кніг

У 1935 годзе ў чытальнях Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна ў Менску зарэгістравана 400 тыс. наведванняў. Чытачам выдана 713 тыс. кніг. Лічбы рэкордныя за ўвесь час існавання бібліятэкі. У хавальнях яе налічваецца паўтара мільёна кніг. У даны момант у Менску — 295 масавых і навуковых бібліятэк — пры Акадэміі навук, навуковых інстытутах, вышэйшых навучальных установах, рабочых клубах, школах — з фондам у 3 мільёны кніг. Гэтыя лічбы асабліва паказальны, калі ўлічыць, што да рэвалюцыі ў Менску налічвалася ўсяго 3 бібліятэкі з кніжным фондам у 30 тыс. кніг.